# ХТО-Ж АДКАЗВАЕ ЗА КАДРЫ?

**ЕНТАВА—Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна.**

Аб злачынных адносінах да маладых бібліятэкараў, да падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў і падняцця іх кваліфікацыі сведчаць многія факты.

Напрыклад, фабзаўкомы заводаў імя Молатава і «Бальшэвік» адзін час зусім ліквідавалі штат бібліятэчных работнікаў. Паставілі на іх месца непадрыхтаваных работнікаў па сумяшчэнню. Зразумела, што пасля гэтага бібліятэкі амаль зусім разваліліся. Ад іх адхлынулі чытачы, больш з імі не толькі ніякай масавай работы не вялося, а іх проста адштурхвалі ад бібліятэк. Так было не толькі на гэтых заводах. Яўна шкодніцкая лінія Наркомасветы БССР і яго бібліятэчнага кіраўніцтва была накіравана на развал работы бібліятэк, як ачагоў распаўсюджання бальшэвіцкай культуры.

З падрыхтоўкай кадраў справа на сённяшні дзень знаходзіцца ў выключна цяжкім становішчы. Кадры не падрыхтоўваюцца. Палітасветныя навучальныя ўстановы і існаваўшыя курсы ліквідаваны ворагамі народа з НКА. Узамен іх нічога не арганізавана. У Менску існавалі курсы школьных бібліятэкараў, але іх, па невядомых прычынах, закрыў гарана, гэтым самым учыніўшы новы шкодніцкі акт у адносінах да бібліятэк.

Бібліятэчнае кіраўніцтва НКА, у асобе яго начальніка т. Маліноўскага, праdaўжае шкодніцкую лінію ворагаў народа, якія кіравалі Наркомасветы.

Маліноўскі абсалютна не цікавіцца становішчам бібліятэчных кадраў. У бібліятэках часта знаходзяць прытулак варожыя людзі, якія скарыстоўваюць прытупленне пільнасці кіруючых работнікаў для шкодніцкай дзейнасці. Ці зацікавіўся хоць раз т. Маліноўскі гэтымі пытаннямі? Не. Наадварот, ён спрыяў таму, каб разваліць гэтую справу.

Пры такім становішчы з кадрамі не можа быць наладжана работа бібліятэк па ажыццяўленню адказных задач, ускладзеных на іх партыяй і ўрадам. Бібліятэкі павінны быць забяспечаны добрасумленнымі, аданымі справе сацыялістычнага будаўніцтва, людзьмі. Але для гэтага неабходна перш за ўсё забяспечыць такімі-ж кадрамі бібліятэчнае кіраўніцтва НКА БССР, якое адказвае за становішча бібліятэк.